## *Віктарына*
## *Зямля бацькоў — мая зямля.*

**Мэта:** стварыць умовы для развіцця пазнавальнай актыўнасці вучняў, для фарміравання іх камунікатыўных уменняў і культуры маўлення, свядомага ўяўлення аб багацці, непаўторнасці роднага слова; абуджаць цікавасць да гісторыі і культурнай спадчыны роднага краю, выхоўваць грамадзянскасць, пачуццё патрыятызму, гонар за сваю Радзіму, за свой народ, павагу да роднай мовы.

**Абсталяванне:** камп’ютар ( прэзентацыя )

**Эпіграф:**

Мяжуе з Польшчай, Украінай,
Расіяй, Латвіяй, Літвой.
Твой родны край, твая Айчына —
Жыццё тваё і гонар твой.
І ты яе запомні імя,
Як неба, сонца і зару.
Твая зямля, твая радзіма
Названа светла —
Бе-ла-русь.

*Юрась Свірка*

### Ход мерапрыемства

**І. Арганізацыйны момант.**

Гучыць песня «Спадчына» (словы Янкі Купалы, музыка Ігара Лучанка). На экране змяняюцца слайды з пейзажнымі замалёўкамі.

**Уступнае слова настаўніка:** Настаўнік зачытвае эпіграф урока **(слайд 1)**, потым працягвае:

— Любоў да Радзімы — гэта не абстрактнае, а рэальнае пачуццё, якое кожны чалавек можа выказаць у штодзённым жыцці шчырымі словамі, карыснымі справамі, светлымі думкамі. Свой родны куточак (малую радзіму) мы любім як часцінку нашай Бацькаўшчыны. А кожная часцінка — своеасаблівы духоўны скарб, які неабходна зберагаць і павялічваць, каб і наступныя пакаленні маглі сказаць: «Зямля бацькоў — мая зямля».

Кожны чалавек павінен ганарыцца той мясцінай, дзе нарадзіўся і жыве: павінен мець пачуццё нацыянальнай годнасці. А гонар, у

сваю чаргу, мацнее ад назапашвання ведаў пра самыя цікавыя і адметныя звесткі з гісторыі роднага куточка: якой была мясцовасць у даўнейшыя часы, адкуль паходзіць назва, якія цікавыя людзі жылі і якімі сваімі справамі, здольнасцямі запомніліся ў народзе. І толькі так узнікае неабдымная любоў да Радзімы, вялікі гонар за яе дасягненні, імкненне зрабіць свой уклад у агульную справу.

Таму першы ўрок навучальнага года мы правядзём у форме віктарыны – своеасаблівае падагульненне таго, што было вывучана ў мінулым.

**II. Паведамленне тэмы, мэты ўрока. (слайд 2)**

**III. Работа па тэме ўрока.**

**1 тур.** Адкажыце на пытанні.

1. Вызначце агульнае ў літаратурнай творчасці Эзопа і Кандрата Крапівы? **(слайд 3)**

1) Эзоп і Кандрат Крапіва былі байкапісцамі;
2) Эзоп і Кандрат Крапіва былі землякамі;
3) Эзоп і Кандрат Крапіва былі равеснікамі;
4) Эзоп і Кандрат Крапіва былі майстрамі драматургіі.

(Правільны адказ: 1) Эзоп і Кандрат Крапіва былі байкапісцамі)

2. Якім псеўданімам падпісваў свае творы Канстанцін Міхайлавіч Міцкевіч? **(слайд 4)**

(Правільны адказ: Якуб Колас)

3. Каго называюць беларускім першадрукаром? **(слайд 5)**

(Правільны адказ: Францішка Скарыну)

4. Што называюць *«беларускім морам»*? **(слайд 6)**

(Правільны адказ: возера Нарач)

5. Які месяц ў народзе называюць *«гаручым, але не даручым»*? **(слайд 7)**

(Правільны адказ: ліпень)

6. Каго называюць нябеснай заступніцай зямлі беларускай? **(слайд 8)**

(Правільны адказ: Еўфрасінню Полацкую)

7. Назавіце славутую беларускую князёўну, дачку Рагвалода, якая мела тры імені (якія?). **(слайд 9)**

(Правільны адказ: Рагнеда — Гарыслава — Анастасія)

8. Па-руску гэта свята гучыць Пасха. А як па-беларуску? **(слайд 10)**

(Правільны адказ: Вялікдзень)

**2 тур.** Пазнайце асоб, якія унеслі значны ўклад у станаўленне беларускай літаратуры. Назавіце прыклады іх твораў. **(слайд 11)**

1. Адам Міцкевіч.
2. Кастусь Каліноўскі.
3. Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч.
4. Францішак Багушэвіч.
5. Максім Багдановіч.
6. Якуб Колас.
7. Янка Купала.

**3 тур.** Закончыце прыказку:

— *Няма смачнейшай вадзіцы, як з роднай ... . (крыніцы)* **(слайд 12)**

— *Для ўсякай птушкі сваё гняздо ... . (міла)* **(слайд 13)**

— *Родная зямелька як змораnаму ... . (пасцелька)* **(слайд 14)**

— *У сваім краі, як у ... . (раі)* **(слайд 15)**

— *На чужыне і камар ... . (загіне)* **(слайд 16)**

— *Кожнаму свой куток ... . (мілы)* **(слайд 17)**

— *Усюды добра, а дома ... . (лепей)* **(слайд 18)**

— *Кожная сасна свайму бору песню ... . (пяе)* **(слайд 19)**

**IV. Хвіліна для адпачынку.** (Гучыць музычны запіс, на экране — слайды з беларускімі краявідамі)

**4 тур.** Па здымку пазнайце архітэктурныя помнікі Беларусі. **(слайд 20)**

1. 12 стагоддзе. **Барысаглебская (Каложская) царква.** Гродна. Выдатным помнікам беларускага дойлідства 12 стагоддзя з'яўляецца Барысаглебская (Каложская) царква, узведзеная ў

Гродна на беразе Нёмана. “Пабудавана на стагоддзі”, - як бы гавораць велізарныя валуны, умацаваныя ў падмурак храма. Унікальнай з’яўляецца вонкавая паверхня сцен, упрыгожаных рознакаляровымі керамічнымі пліткамі ў форме крыжоў, ромбаў і разетак. Да гэтага часу здзіўляе непаўторная акустыка царквы, утвораная дзякуючы замураваным у верхнія часткі сцен збанам-галаснікам. Яны з’яўляюцца рэзанатарамі гукаў і ўтвараюць у сценах храма гулкае, шматгалосае рэха.

2. 14 – 15 стагоддзі. **Замак у Навагрудку.** Навагрудак – першая сталіца Вялікага княства Літоўскага. Зразумела, што Навагрудскі замак быў некалі багатым і знакамітым. Ён з’яўляўся цэлым комплексам абаронных збудаванняў. На жаль, замак разбурыўся, страціўшы сваю былую веліч і значэнне горада. Толькі з сярэдзіны 20 стагоддзя Навагрудскі замак стаў аб’ектам увагі археолагаў, якія адкрылі нямала цікавых старонак гісторыі старажытнага беларускага горада.

3. 15 – 16 стагоддзі. **Свята-Міхайлаўская царква ў Сынкавічах.** У канцы 15 – пачатку 16 стагоддзяў яўны абарончы характар сталі насіць нават культавыя пабудовы. Свята-Міхайлаўская царква ў Сынкавічах Зэльвенскага раёна Гродзенскай вобласці ўзведзена ў 1407 годзе. Помнік культава-абарончага значэння ў стылі позняй гатычна-рэнесанснай архітэктуры.

4. 18 стагоддзе. Ружаны. **Палацавы комплекс.** Рысы барока выразна прасочваюцца ў лепшых помніках палацава-сядзібнай архітэктуры 18 стагоддзя. Адным з іх быў палацавы комплекс у Ружанах (Пружанскі раён Брэсцкая вобласць), фрагменты якога захаваліся да нашых дзён. У пачатку 17 стагоддзя гэта рэзідэнцыя рода Сапегаў уяўляла сабой добра ўмацаваны палац з трыма масіўнымі вежамі. У час рэкнструкцыі ў першай палове 18 стагоддзя палац атрымаў новае, тыповае для барока рашэнне.

5. **Гродзенскі абласны драматычны тэатр.** Арыгінальнае архітэктурнае рашэнне будынка Абласнога драматычнага тэатра ў Гродна (архітэктар Мачульскі) у многім вызначыла месцазнаходжанне на высокім беразе Нёмана ў непасрэднай

блізкасці да гістарычных забудоў горада. Кампактны шасцігранны аб'ём атрымаў своеасаблівае афармленне.

6. **Будынак Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі.** Можна смела сказаць, што будынак Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, узведзены ў 2006 годзе па праекце архітэктараў Вінаградава і Кармарэнка, з'яўляецца прадметам гонару мінчан і выклікае захапленне ў гасцей горада. Магічны крышталь ведаў прыгожы ў любы час, але асабліва прывабны ён у перадвячэрні час, калі асвятляецца не толькі промнямі сонца на захадзе, але і рознакаляровымі агнямі ілюмінацый, створаных на аснове самых перадавых тэхналогій.

**5 тур.** Адкажыце на пытанні.

1. Ён – сын князя Кейстута, жыў з 1350 да 1430 г. Пры ім дзяржава, якую ён узначальваў, мела дыпламатычныя адносіны амаль з усімі заходнееўрапейскімі краінамі. *(Вітаўт)* **(слайд 21)**

2. Беларускі народны тэатр лялек, які вядомы з 16 ст. *(Батлейка)* **(слайд22)**

3. Найбольшая рака Беларусі. *(Дняпро)* **(слайд 23)**

4. Самы старажытны горад Беларусі. *(Полацк)* **(слайд 24)**

5. Найстарэйшы літаратурны часопіс Беларусі. *("Полымя")* **(слайд 25)**

6. Мужчынскі галаўны ўбор, які плялі з саломы, лазы, чароту і насілі летам. *(Брыль)* **(слайд 26)**

**Заключнае слова настаўніка: (слайд 27)**

— Сённяшні мерапрыемства дало нам магчымасць яшчэ раз зразумець, што мы жывём у цудоўнай і непаўторнай, багатай на гістарычныя падзеі краіне. І дзе б мы ні апынуліся, куды б ні закінуў нас лёс, у нашай душы, у нашым сэрцы заўсёды будзе з намі адчуванне моцнай повязі з родным краем, зямлёй нашых бацькоў. Пакуль мы паважаем сваіх продкаў, не забываемся сваіх каранёў, мы паважаем Радзіму, мы існуем як народ, як нацыя.

Любіце свой край. Кожны дзень адкрывайце для сябе няўлоўную прыгажосць роднага куточка. Прыслухоўвайцеся да нашай пявучай мовы. Заўважайце дабрыню, адкрытасць, таленавітасць нашага народа. І вы адчуеце ў душы вялікі гонар за сваю Радзіму.

Паклон табе, мой беларускі краю!
Ты — мой, я — твой: ад роду і навек.
Я зноў і зноў да сэрца прыкладаю
Твой ліст дубовы — як чароўны лек.
За хлеб, што ем, за песні, што спяваю,
За шчасце звацца іменем тваім –
Паклон табе, мой беларускі краю!
Ты — мой, я — твой: усюды і ва ўсім!

*Ніл Гілевіч*

*Мяжуе з Польшчай, Украінай,*
*Расіяй, Латвіяй, Літвой.*
*Твой родны край, твая Айчына —*
*Жыццё тваё і гонар твой.*
*І ты яе запомні імя,*
*Як неба, сонца і зару.*
*Твая зямля, твая радзіма*
*Названа светла —*
*Бе-ла-русь.*

*Юрась Свірка*

# Зямля бацькоў – мая зямля



**1.** Вызначце агульнае ў літаратурнай творчасці Эзопа і Кандрата Крапівы?
**1)** Эзоп і Кандрат Крапіва былі байкапісцамі;
**2)** Эзоп і Кандрат Крапіва былі землякамі;
**3)** Эзоп і Кандрат Крапіва былі равеснікамі;
**4)** Эзоп і Кандрат Крапіва былі майстрамі драматургіі.

*!*



**2.** Якім псеўданімам падпісваў свае творы Канстанцін Міхайлавіч Міцкевіч?



Якуб Колас

**3.** Каго называюць беларускім першадрукаром?





Францыск Скарына

**4.** Што называюць *«беларускім морам»*?



возера Нарач

**5.** Які месяц ў народзе называюць *«гаручым, але не даручым»*?





ліпень

**6.** Каго называюць нябеснай заступніцай зямлі беларускай?



Ефрасіння Полацкая

**7.** Назавіце славутую беларускую князёўну, дачку Рагвалода, якая мела тры імені (якія?).



Рагнеда
Гарыслава
Анастасія

**8.** Па-руску гэта свята гучыць Пасха. А як па-беларуску?



Вялікдзень















*Няма смачнейшай вадзіцы,*
*як з роднай…*

*крыніцы*

*Для ўсякай птушкі сваё гняздо …*

*міла*

*Родная зямелька як зморанаму …*

*пасцелька*

*У сваім краі, як у …*

*раі*

*Усюды добра, а дома …*

*лепей*

*Кожная сасна свайму бору песню …*

*пяе*

*На чужыне і камар …*

*загіне*

*Кожнаму свой куток …*

*мілы*













**1.** Ён – сын князя Кейстута, жыў з 1350 да 1430 г. Пры ім дзяржава, якую ён узначальваў, мела дыпламатычныя адносіны амаль з усімі заходнееўрапейскімі краінамі.

*Вітаўт*

**2.** Беларускі народны тэатр лялек, які вядомы з 16 ст.

*Батлейка*

**3.** Найбольшая рака Беларусі.

*Дняпро*

**4.** Самы старажытны горад Беларусі.

*Полацк*

**5.** Найстарэйшы літаратурны часопіс Беларусі.

*“Полымя”*

**6.** Мужчынскі галаўны ўбор, які плялі з саломы, лазы, чароту і насілі летам.

*Брыль*

*Паклон табе, мой беларускі краю!*
*Ты – мой,я – твой: ад роду і на век.*
*Я зноў і зноў да сэрца прыкладаю*
*Твой ліст дубовы – як чароўны лек.*
*За хлеб, што ем, за песні, што спяваю,*
*За шчасце звацца іменем тваім –*
*Паклон табе, мой беларускі краю!*
*Ты – мой, я – твой: усюды і ва ўсім!*

*Ніл Гілевіч*